ЛІДЗІАНА

# Прызнанне

Вершы

*Кніга першая*

Гомельская гарадская
цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма

ЦГБ імя А. Герцэна
Краязнаўства

Гомель
РПУП "Палесдрук"
2003

***Майму земляку,***
***цудоўнаму беларускаму паэту***
***Анатолю Грачанікаву***
***гэта кніга прысвячаецца...***

Трэба песню тваю
мне дапець...
Вось чаму яшчэ жыць
я павінна.

* * *

Не сумняваюся ў любові, не:
Як незвычайна гулка
Сэрца б'ецца
Ад слоў пра Беларусь.
І мне здаецца –
Ад роднай мовы цеплыня ўдвайне.

Ты разбудзіў, хоць за руку не браў,
Але падвёў да мовы,
Як да маці,
І каб яна гучала ў маёй хаце,
Сузор'е думак мне сваіх
Аддаў.

Іскрацца твае словы-прамяні,
Бароў зарэчных
Шэптам размаўляюць,
Старонку родную благаслаўляюць,–
Нікому гэту песню
Не спыніць.



# Мурашы на чоўне

* * *

*Сыну Сяргею*

Лісцік кволы адарваўся –
З дрэва паляцеў і знік…
Дуб магутны хваляваўся:
Сын без бацькі не прывык.

Ветрам кінула дзіцяці –
Неслух на суку сядзеў,
Злез з яго, як па канаце,
За вятрыскам паляцеў.

Хай бы рос ён з жалудамі,
Лёг прыгожым дыванам,
Можа б людзі падабралі,
Ды занеслі ў цёплы дом.

Не, панесла яго нанач,
Вецер толькі ў галаве!
…На лістку плылі удалеч
Мурашы, як на чаўне.

*1994*

## БЭЗ

Ламаюць бэз, каму ахвота:
Нячутна ўсхліпваюць кусты.
Тут з дроту плот быў за гародам,
Наўкола зараз двор пусты.

Стаяла там нядаўна хата –
Знялі і не вярнуць назад.
Жылі тут сціпла, небагата:
Усё багацце – хлеў ды сад.

Знялі хлявок, спілілі дрэвы –
Яшчэ трапеча кожны зрэз.
Калісьці тут, за даўнім хлевам,
Расцвіў аднойчы гэты бэз.

Пакінуў хтосьці яго з жалю,
Ці часу вырваць не знайшоў…
Рвуць бэз квітнеючы для балю
І проста так, хто б ні прайшоў.

## МОЙ СЛЕД

Напэўна, Бог дае нам памяць,
Ды толькі на адно жыццё,
Каб узлятаць маглі і падаць,
І кожны крок быў адкрыццём.

Якім быў крок мой самы першы
І след пакінуў ён які?
Ці поўнілася сэрца вершам,
Калі я рвала васількі?

Якою я была істотай?
Ці можа вострай на язык?
І ці кахаў мяне хто ўпотай?
Ці проста да мяне прывык?

Дачку ці сына нарадзіла?
Хвалілі, можа, ці клялі?
І дзе была мая Радзіма,
Ці з ёй сустрэнуся калі?

* * *

Сцяжына, што вядзе мяне дамоў…
Па ёй таропка некалі хадзіла,
Знайшла надзею, веру і любоў,
Ды вось гады, гады свае згубіла.

А век наступны сцежкаю брыдзе.
Гады мае ў рацэ тысячагоддзяў,
Нібы кругі расходзяцца ў вадзе,
Ці як дзяўчаты ў дружным карагодзе.

Ды я з надзеяй зноўку гавару
Пра веру і любоў у родным краі.
І слухаю зязюлю у бару,
І чую – гэтак хораша кувае!

## БАЗАР

Церахоўка. Тут базар
Быў калісьці для пасёлка.
Для людзей дык проста дар,
Як пасля дажджу вясёлка.

А каля шасці гадзін
Шпарка рухаюць падводы.
Парасят вязе адзін,
Хтосьці буркі – выклік моды.

Хтось гандлюе малаком,
Маслам лепшага гатунку...
Нам жа з братам Васільком
Спадабалася свістулька.

Слаўны пеўнік-пявунок!
Вочкі, як зярняткі мака,
І чырвоны грабянёк,
І спяваў, як задавака.

Новы дом цяпер стаіць
На тым месцы ў Церахоўцы,
Толькі сэрца зашчыміць,
Як па згубленай свісцёлцы.

# ВЁСЦЫ

Заўсёды еду да цябе у думках,
Куды б ні кінуў добры неспакой.
Знаходжу сэрцам кроплю паратунку
І ганаруся, родны кут, табой.

І радасна, як добрая сяброўка,
Усіх ты сустракаеш кожны раз…
Табе мы ўдзячны, вёска Лебядзёўка,
Што ты адна не забываеш нас.

## КРАЛЁЎКА

Радаўніца. Вёсачка Кралёўка:
Дзесяць хат вялікіх і малых,
Слуп і заржавелая рыдлёўка,
Цётка Прося «пераводзіць дых».

Грыша, Яшка, Надзя і Хрыцінка
Адзінокі дажываюць век,
Ды як слёзы змахваюць хусцінкай,
Ні адзін не бачыў чалавек.

Дажывае век бязногі Ціхан
З Дуняй у хаціне на краю –
Вось і ўсё!
Жывуць тут мірна, ціха,
Кожны дзень, нібыта у раю.

*29.04.1998*

* * *

О Госпадзі!
Як хутка век прайшоў!
І тры гады Кралёўка сірацела:
Напэўна, Ціхан раю не знайшоў –
Таму і піў, пакуль трымцела цела.

Хрыцінка адышла ужо дамоў,
І з Просяй побач помнік на пагорку.
І Надзя Малаёўская ізноў
З суседкай ля крыжа пачне гаворку…

Прыходзяць толькі трое да магіл,
Ці плачуць, ці гавораць – невядома.
А, можа, просяць дачакацца сіл,
Швартоўкі міжсусветнага парома.

*15.05.2002*

# НАДВЯЧОРКАМ

Гармонік грае надвячоркам
На ўсе басы, на ўсе лады.
І ў маім  сэрцы струны тонкія
Кранае голас малады.

І сон прыцiх над Лебядзёўкай:
Глядзіш – навокал ні душы,
Ажно да зор чуваць, як зноўку
Блукае песня у цішы.

Адразу сэрца маладзее,
Аднекуль мара прыплыла.
І ажыла мая надзея,
І песня крылы ёй дала.

## ЗВАНЫ ЧАРНОБЫЛЯ

Званы Чарнобыля
ў душы звіняць,
Бо я хаджу
па стронцыю і ёду…
За будучыню
крыку не стрымаць:
Зноў пагражае смерць
майму народу.

Але крычаць
з трыбуны ў мікрафон,
Што генафонд
навука уратуе.
Павышаны
радыяцыйны фон
З ахвяр
ім дысертацыі габлюе.

І за якія
даўнія грахі
Майму народу
гора і пакуты?
…Нябачна йдуць
з Чарнобыля шляхі
Па ўсёй зямлі,
як скрытай смерці путы.

## ВЁСКА РУДНЯ

Радыяцыяй
і дротам
Вёску Рудню
абняслі.
Крыкі птушак
над балотам –
Плач
атручанай зямлі.

Ты, бязлюдная,
сцішэла,
Загубілася
ў траве…
Вёска Рудня,
як ты пела!
Вось памінкі
па табе…

Крыж на могілках,
на хаце,
На разбуранай
страсе,
На каханні
бацькі, маці,
Ёю тканым
абрусе.

Крыж на будучым,
мінулым,
На маўчанні
толькі – не…
Вёска, як табе
балюча:
Без вайны
ты – на вайне.

…Словам верша,
словам песні,
Словам высмяглай
душы,
Як жывецца
на Палессі,
Вёска Рудня,
раскажы.

# МАЛІТВА ПЕРАСЯЛЕНКІ

Мой старажытны родны край Палескі
Зжаўцелых соснаў ловіць перазвон.
Атрутаю напоўнены пралескі,
А поўніліся марамі спакон.

Зямля мая, што грэла душы продкаў,
Нашчадкам не пакінула раллю.
А я цябе, жабрачкаю без сродкаў,
Яшчэ мацней гаротную люблю.

Калодзеж з жураўлём, што каля хаты,
Прабач, што не прыходжу за вадой,
З табою размаўляе плот шчарбаты
І дзеліцца з табой сваёй бядой.

Прабачце, мае яблынькі і грушы,
Мяне і ўсіх палескіх землякоў.
З выгнання, нібы птушкі, нашы душы
Натомлена вяртаюцца дамоў.

## ВЯРНІЦЕ ПРЭМІЮ

Як лёс, Чарнобыль уладарыць,
Віноўнікаў няма даўно –
Яны у Мінску гаспадараць,
Ўсплылі наверх, нібы…дзярмо.

Нам абяцалі, маўляў, будуць
Паветрам дыхаць, што і мы,
Але ў радыяцыйным брудзе
Будуюць толькі нам дамы.

Асфальт кладуць на стронцый, цэзій,
Вырошчваюць атрутны хлеб,
А на жыццё няма ліцэнзій…
Здароўе наша без патрэб.

І абы-як абмыюць хаты,
За гэта прэмію – ў кішэнь.
І зноўку нашыя салдаты
Для радыяцыі – мішэнь.

# МЯСАКАМБІНАТ

Працуе мясакамбінат,
Машыны там смакуюць трупы.
І нават скручаны шпагат
Каўбаскай пахне,
Не атрутай…

А у вачах каровак – страх,
Ён ім істоты напаўняе.
Ідуць на бойню самі – жах!
Як іх яшчэ душа трымае…

Ядзім каўбаску. Па начах
Аберагаюць нас анёлы,
Але аднойчы пройме страх,
Як боль істоту ўсю жывёлы…

І крык застыне у вачах,
Замрэ малітва над касцёлам.

* * *

Сабака вые на балконе,
Каб выказаць сваю тугу.
Мо, гэта жальба, што ў палоне,
Ці што адзін на ланцугу.

Мо, вартаваць тут знадаела
Кватэру гэту, розны хлам.
Дык вые так, нібы заела
Пласцінку, з горам папалам.

І вые бедны той сабака:
Паверх дзевяты і ланцуг…
Ці мне завыць, як небарака,
Ды так, каб гэты свет аглух..

* * *

О Божа мой,
Грахі мае прабач!
Прашу ў Цябе
Свайго выратавання.
Мой розум нада мной,
Нібы крумкач,
Лятае, кружыць
Зранку да змяркання.

Не апраўдаць мне
Слепату сваю:
Я адмаўляла Бога,
Пагарджала,
На вецер словы
Часцяком кідала…
Як я віну такую
Загаю?

Ні Бога, ні анёла, ні святых –
Ішла да камунізму я дарогай.
Ужо няма
І камуністаў тых…
Ёсць людзі,
Збераглі што веру ў Бога.

Я верыла
Ідэі толькі той,
Спяшалася
Дайсці хутчэй, нябога…
Напэўна, я не стану ўжо
Святой,
Але памру хоць
З вераю у Бога.

# РОДНАМУ ГОРАДУ

Будзь шчаслівым,
Горад па-над Сожам,
Будзь заўжды
Прывабным і прыгожым
І красой здзіўляй заўсёды нас.
Для мяне ты стаў
Дзівоснай казкай,
Падарыў мне
Дабрыню і ласку.
І падорыш іх яшчэ не раз.

Тут жыве
Каханы мой, надзея,
Тут знаёма
Кожная падзея,
Гомель для мяне – на ўсё жыццё!
На душы развееш, горад,
Хмары,
Яваю асветліш
Мае мары,
Стомленае сэрца – пачуццём.

## АДВЕЧНАЕ

Як між людзей,
Між небам і зямлёй
Любоў бывае,
Ды яшчэ якая!
Калі зямля маркоціцца,
То з ёй…
Таксама неба слёзы праліvае.

Зямля лагодзіцца,
І – дождж грыбны
Нябёсы на зямліцу
Пасылаюць…
І жалудам
Магутныя дубы
Адвечну песню-калыханку
Баюць.

Квітнее ўсё
І песціцца наўкол,
І песняю струменіцца,
Ліецца:
Узгоркі, рэкі,
Горы, лес і дол –
Усё ў Сусвет
З усмешкаю нясецца.

* * *

Цютчаўская, шчырая зямля,
Стрэчы кожны год з табой чакаю!
Веру, шчасце тут спаткала я.
I з падзякай галаву схіляю.

Перад трэллю птушак у бары,
Перад кропляй кожнае расінкі,
Што звісае з кветкі да зары,
Нібы на плячах маіх хусцінка.

З Оўстугам стракаюся, затым
Адчуваю ўзнёслае натхненне…
З помнікам паэта, як жывым,
Размаўляю, поўная здзіўлення.

Цютчаўская, шчырая зямля,
Веру, што спаткала шчасце я.

* * *

О Эльбрус!
Суровай сівізной
Вабіш да сябе,
Завеш здалёку…
Толькі думкай
Да вяршыні той
Дакрануцца можна
Ў гэту спёку.

Я схіляю
Сваю голаў ніц,
Я – дачка раўнін –
Табе гукаю:
– Дай напіцца мне
З тваіх крыніц
І далонь падставіць
Вадаграю.

## СТУДЗЕНЬ

Які іскрысты снег, пушысты,
Лёг на яліны, на зямлю!
Мароз у студзені яршысты,
А я за моц яго люблю.

За музыку хады рыпучай,
За чараўніцтвы на акне,
Што без жалобы даў сыпучых
Сняжынак прама ў рукі мне.

* * *

Зіма усё запаланіла,
Заслала, выветрыла ўраз.
Мяцеліца святло закрыла,
А ты святла чакаў якраз.

Зіма лютуе, і злуецца,
І стогне, нібы ў клетцы звер,
Марозам скоўвае азерца,
Але цяпло жыве у сэрцы,
А разам з ім жыве давер.

## НА ВАКЗАЛЕ

Нясе дзіця сваё кабета.
Вакзал. Цягнік. Людзей натоўп.
Убачыць хтосьці змог паўсвета,
А злы на свет увесь, як воўк.

Людскія лёсы, як струмені,
Зліліся ў гуле ў вадаспад…
Мне пуста, як раллі без зерня,
Што не калосіць сонцу ў лад.

Стаю ў натоўпе, як чужая
Для ўсіх на свеце…Ды, хаця,
Далонькі, Маці Прасвятая,
Працягвае да мяне дзіця…

* * *

*Зінаідзе Плешкуновай*

Была даяркай мая маці
Аж 30 год...
Як час бяжыць!
І я – старэйшая дзіцяці –
Вучылася ў яе даіць.

Чатыры падрасталі дзеўкі.
На ферме, з матчынай рукі,
Былі вясёлыя прыпеўкі,
І смех, і хлопцы ўсё-такі.

Бывала, як на танцы пойдзем –
Да дзвюх гадзін. А ў тры – ўставаць.
І адгаворак не знаходзім,
Але не думалі злаваць.

Паспець усюды мы хацелі,
І вось жывём не горш людзей.
Гады, нібыта на вяселлі
Прапілі. Карагод гудзе.

...Цалую матчыны далоні,
Што пахнуць цёплым малаком.
Яе сівыя гладжу скроні,
Слязу ўціраючы тайком.

# ДЗЯДЗЬКА

*В. Плешкунову*

Прыйшоў з вайны мой родны дзядзька,
Прайшоў па хаце, сеў у кут:
– Дык раскажыце, дзе мой бацька,
Дзе ўся сям'я? І як вы тут?

Суседзі замаўчалі ў скрусе,
А дзядзька – адвярнуўся ён…
Сябе у рукі ўзяць прымусіў,
І медалёў пачуўся звон.

Мой бацька уздыхнуў: «Эх, братка!
Спалілі вёску… Толькі тын
Застаўся… Расстралялі татку,
Бо – партызан ягоны сын.

Забілі каты нашу маці
З тваёю жонкаю… Дзяцей…
Спалілі там, у вашай хаце,
А з імі шмат каго з людзей».

Глядзела я, як дзядзька плакаў,
Як слёзы па шчацэ плылі.
І папрасіла яго раптам,
Каб падарыў мне медалі.

Ён зняў з грудзей узнагароды:
– Вазьмі, пляменніца, гуляй –
Наш парастак, надзея роду…
Быў пераможны месяц май.

* * *

*Словам, як цвіком,*
*Прыбіта душа...*
Ніна Шклярава

На крыжы распятая сяброўка
І прыбіта словам, як цвіком.
Не ўзляцець…
Як божая кароўка,
Што махае зломаным крылом.

І няёмка – не мяне распялі,
Праміну́лі неяк незнарок.
Мне ў той час сімфоніі пяялі,
За спіной кля́лі…
Сабе на ўрок.

## СТАРАЯ

Кажуць, столькі год і не жывуць:
Ці ад ветру вусны пасінелі,
Быццам прастаяла на панэлі,
Ці ў чаканні – можа пададуць.

Кожная маршчына – гэта шлях,
Знойдзеш на якім адны пакуты.
Можа, не жыццё было, а жах,
Які ўсёй істотаю прачуты.

Валасы туманам паляглі,
Ды маршчын нікольні не схавалі.
Толькі вочы быццам не змаглі
Вечнасці аддаць блакіту хвалі.

Гляну і успомню – гэта я,
У сваіх гадочках заблудзілася…
Дзеці ёсць і у дзяцей сям'я,
Я ж нібыта толькі нарадзілася.

# СЯБРОЎЦЫ

*Н. Шкляравай*

Казалі добрых слоў нямала,
Нямала зайздрасці было,
Як хлеб, цяпло ты аддавала
І слова, што ад сэрца йшло.

А як ты хораша смяешся,
Узняўшы вочы да нябёс,
Што ўсім шчасліваю здаешся…
Ды праўду знае толькі лёс.

# ХАЙ УСЯВЫШНІ ЧУЕ НАС

*А. Алешыне*

Ці так даўно сямнаццаць год
Спраўляла маміна дачушка.
Вось і твае гады, як птушкі,
А потым – нібы карагод.

Няхай жа задуменны час
Пакіне ў сэрцы летуценні,
Журбу разгоніць і сумненні,
Хай Усявышні чуе нас!

Табе насустрач хай ідзе
Хлапец, душой і сэрцам шчыры,
І прыжывецца між людзей
Радок тваёй натхнёнай ліры.

## ДАЧУШЦЫ

Дачушка мая, Кацярына!
Твае валасы, як з бурштыну,
А вусны, нібыта шыпшына,
Што выспела ў вёсцы ля тына.

Я кожны малюся дзянёчак,
Каб ззялі святлом твае вочы
На радасць і Богу, і людзям…
І веру, што так яно будзе.

Дачушка мая, Кацярынка,
Жыццё не заўсёды пярынка.
Калі ў тваім сэрцы хмурынка –
Лажыцца на твар мой маршчынка.

Ты ведай, мая дарагая,
Цябе я – аберагаю,
А потым можа, дасць Божа,
Сустрэнецца хлопец прыгожы.

Тады буду песні спяваць
І нават Сусвет абдымаць:
Ляці па жыцці, мая Каця!
Табе маю мару
Люляці.

* * *

Зямлі куточак
Прашчураў маіх,
Паклон табе,
Працоўны мой народзе.
Сцяжынам дзякуй –
Ходзіш па якіх,
І шляху –
Па якому сын мой пойдзе.

Зямліца родная!
Ты у душы,
Як маці родная
У кожнай справе.
За сына Чэслава прашу,
Дапамажы
Жанчыне светлае –
Чаславе.

## ЧАСЛАВЕ - МАРЫІ

*– Памірае мая маці.*
*Яна – маё жыццё.*
З тэлефоннай размовы

Слаўная жанчына – маці,
За цябе малю я Бога,
Каб жыла ты ў сваёй хаце,
Лёгкаю была дарога.
І каб стомленыя рукі
Ўнучку гладзілі, Юсціну…
Каб не зналі яны мукі
Раставання з сваім сынам.

Роднае зямлі малюся
За сумленную жанчыну,
Ёю я здаўна дзіўлюся
Нібы чысцінёй бурштыну.
Край мой, праведны і мілы,
Не згасі прамень надзеі,
Дай здароўя ёй і сілы
Пры любых жыцця падзеях.

Я нарву яшчэ ёй кветак,
Каб заззялі шчасцем вочы:
Абыйду прасцяг палетак,
Зёлак назбіраю ўночы.

Я вазьму вады з крыніцы,
Асвячу яе ў касцёле…
Хай святою прычасціцца,
Смагу хворую утоле.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Божа! Ўсемагутны Божа!
Ці малітву гэту чуеш?
Можа Ты ёй дапаможаш?
Можа Ты яе ўратуеш?

## БАЮ-БАЮ, МОЙ СЫНОК

*Чэславу*

Ноч блукае каля хаты,
Серпік месяца бяжыць.
Рукі дужыя у таты,
На руках сынок ляжыць.
Тата песеньку спявае:
«Спі, маленькі мой сынок!
Нібы коўдрай накрывае
Хмарка месяца сярпок.
Баю-баю, мой сынок,
Вее ветрык, бы ўюнок!
Не вярціся, галубок,
Засынае мой сынок,
Закрывае вочкі,
Вочкі-васілёчкі,
А я байку баю,
Песеньку спяваю…»
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Спіць маё дзіцятка,
А з ім побач татка.
Ім дваім спяваю:
«Баю-баю-баю».

*1993*

* * *

Ай люлі, люлі, люлі…
Прыляцелі матылі,
На кветачкі селі,
Ды мядку пад'елі.

Шэрыя казюлькі
Вылезлі з рагулькі,
Папаўзлі ў куточак,
Дзе  гуляў сыночак.

Хітрая сарока
Падмігнула вокам.
Добры чмель кудлаты
Паляцеў дахаты.

Люлі, люлі, ай-люлі!
Задрамалі матылі.
Мы з сыночкам селі
І спаць захацелі.

## КАЛЫХАНКА

*Унучыку Цімуру*

Скача поўня ў хаце,
Дражніць немаўляці,
Мой унучак плача,
Як злавіць той мячык?
Я ж яму спяваю:
– Баю-баю-баю.
Мой маленькі коцік,
Зачыні свой роцік,
Вунь з чулана вожык
Каціцца без ножак –
Пападзе ў раток,
Ці табе пад бок,
Ціхенька ляжы,
Ледзянец ліжы.
Курачка сакоча,
У хлявочак хоча.
Спяць там кураняткі,
Яе дзіцяняткі.
Спі і ты, Цімоша,
Мой унук харошы.
Скача сон, як поўня,
Ценькае у скронях.
Баю-баю-баю
Побач засынаю.

# ПЕРШЫ КРОК

*Чэславу*

Твой першы крок, сынок, благаслаўляю:
Змог лёгка, з асцярожнасцю ступіць.
Я будучыню думкаю люляю,
Каханнем наваколле напаўняю –
Хачу саломку загадзя сцяліць.

Пайшоў ты рана, дзевяць не мінула,
А дактары прадказвалі бяду.
Струну нябеснай ліры закранула,
Нібыта лёсу крыламі ўзмахнула,
І ў неабсяжны свет цябе вяду.

Мой сын, дай Бог табе, майму нашчадку,
У сэрцы дабрыню не загасіць.
З падзякай помніць маці, ды і татку,
Заўсёды ў цемры бачыць промняў кладку,
Бясконца веды з мора мудрых піць.

Глядзець удаль блакітнымі вачыма
І мару матчыну, як я, люляць,
Сустрэць найлепшую ў жыцці дзяўчыну,
Спазнаць каханне – радасці прычыну,
І ўсё жыццё яго аберагаць.

*1993*

# БАЦЬКУ

Аднойчы прыйдзе з цеплынёй
Сын да зямлі тваёй з паклонам,
Тваёй не зойдзецца хлуснёй,
Тваім не стане ён праклёнам.

Хоць сын мой і без бацькі рос,
Ішоў жыццём, як роснай сцежкай,
Не праклінаў ён ні нябёс,
Ні тваю здзеклівую ўсмешку.

Твой сын шчаслівы лёс знайшоў,
Хоць розныя былі дарогі,
Хаця убачыў многа сноў
Трывожных, без тваёй падмогі.

Сабою ганарыцца сын,
Бо ён зрабіў дабра нямала.
Чым ганарышся зараз ты,
Ягоны бацька разудалы?

# Я НЕ СКАРЫЛАСЯ

Я не скарылася…
Ад брудных слоў тваіх.
Я толькі з часам
Дабрынёй адмылася.
Не даў нам Божа
Шчасця на дваіх…
За лёс дзяцей сваіх
Я не скарылася.

Я не скарылася,
Калі матуля мне
Адмовіла ў цяпле…
Як я малілася!
Такое ў цяжкім
Не прысніцца сне…
Канец жыцця? Але
Я не скарылася.

Я не скарылася…
Хай лёс дзяцей міне
Той, ад якога я
Крыху стамілася!..
Прабач, зямля мая,
Ну як ты без мяне?!
Ты рада, што я так
І не скарылася?!

**ТАБЕ**

Як у раллі набраклыя зярняты,
У сэрцы твае вершы прараслі,
Бо кожны твой радочак,
З кнігі ўзяты,
Нібы з маёй сатканы цеплыні.

Табе – удзячнасць ціхая народа,
Але ж і пазайздросціць можна мне:
Твой кожны верш –
Мая узнагарода,
Я ганаруся ім, бо ён ва мне жыве.

# РОДНАЯ МОВА

Як толькі чую голас родны,
Прывабны для мяне, лагодны,
Іду з усмешкай па жыцці
І хочацца яшчэ ісці.

Адкуль і сіла набярэцца:
Маё усхвалявана сэрца,
І ажываюць летуценні,
І ў працы дзіўнае натхненне.

Як добра, што ты ёсць на свеце,
І голас мой люляе вецер,
Пралескамі шчыруюць вёсны,
Як словамі радок узнёслы.

* * *

Што ёсць ласкавей беларускай мовы,
Якая ад людской знявагі гіне?
Былі падтрымкай роднай мовы словы,
Калі жыла далёка на чужыне.

Была ў вялікім смутку я калісьці,
Пачуўшы спеў аб роднай старане.
Што стала дарагім яшчэ з калыскі,
Заўсёды скарбам будзе для мяне.

Дык сэрца грэй і будзь яшчэ ласкавей,
Хвалюй, як водар кветак па вясне.
Ты мне штодня патрэбна не для славы,
А для душы,
Як сонца у акне.

# КАЛЫСКА РАЮ

*Трыпціх*

I

Кажуць, што калісьці
Нават Бог
Жыць
На Беларусі нашай мог.
Быў тады чысцюткі
Родны краю –
Кветак навакол,
Нібы у раі.
І паветра,
Як з крыніц вадзіца:
П'еш, і ўдосталь
Не можаш напіцца.

Ды даўно
Атручаныя рэкі
Пахавалі
Даўні рай навекі.
Вочы поўняцца
Былога раю
Стронцыем і цэзіем…
Мой краю
Гора на руках сваіх
Калыша,
Просіць дапамогі
Ва Ўсявышняга.

II

І не толькі
Горы і нізіны
Наракаюць
На свой лёс…
Павінны
Перад сваім родам
Беларусы,
Бо зракліся
Роднай мовы вусны.
Бо схілялі голаў
І маўчалі,
Калі іхні душы
Рабавалі,
І глуміліся
Над родным словам…
Дык калі ж
Падымеце галовы?

III

Беларусь мая,
Калыска раю!
Чаму ж рады не дасі
Адчаю?
Апынулася
Як пад прыгнётам?
Разам з роднай мовай
І народам…

Трэба бараніці
Нашу мову,
Роду беларускага
Выснову.
Выйсці разам,
Як вясной – азёры,
І як рэкі
Роднае старонкі:
Змыць брыдоту ўсю,
І родным словам
Выпісаць
Гісторыі старонкі.

* * *

Пазіраю на іконы лік,
Бо сягоння маё сэрца ў скрусе.
Мова беларуская у ім,
Якой няма ходу ў Беларусі.

Колькі адбылося ўсіх падзей!
Ды свая ў душы даўно выснова:
Разлічыць радню сярод людзей,
Можа толькі матчынае слова.

Я вучу сваіх траіх дзяцей
Ганарыцца сваёй роднай мовай.
Будуць беларусамі хацець
Праўнукі і ўнукі радаслоўнай.

## ПАЭТУ

Доўга жыць мне на гэтай зямлі,
Адчуваць сэрцам Космасу хвалі –
Нібы з Тонкага Свету пазвалі,
Ды чамусьці забраць не змаглі.

Я павінна так многа зрабіць,
Навучыцца удзячнай быць Богу,
Свайго любага здраду забыць,
Калі трэба – прыйсці на падмогу..

Дабрыні навучыцца б паспець –
Перадаць і дачушцы, і сыну.
Трэба песню тваю мне дапець –
Вось чаму яшчэ жыць я павінна.

* * *

Калі удачу стрэнеш,
То не ганарыся,
Пра грахі успомні
У шыкоўны час.
А калі  адчаю
Ў горы не скарыўся –
Гавары аб гэтым
Сабе кожны раз.

Калі табе скажуць,
Ты – мацнейшы ў свеце,
Не дазволь спыніцца
Ты сабе на тым.
Засланіць памкніся
Ад вятрыска вецце,
Што ў акенца стукае
Пад дажджом густым.

І я была кволаю
Нібыта галінка.
Поспех мой не вечны,
Гэтак не дзівіся.
На тваёй дарозе
Сціплаю дзяўчынкай
Я стаю дагэтуль…
Можа азірніся?

…Занялася зорачка
Ясная увысі…

# ЭЦЮД

Пажоўклы лісцік
падаў мне пад ногі,
У роспачы
цалуючы абцас.
Здалося, што ён плакаў
ад знямогі
І ад бясілля,
што не вернеш час.

Я падняла той ліст,
нібыта кветку,
І задумёна
на яго гляджу.
Вісеў на вершаліне
ён улетку,
Пакуль не надакучыў
сам дажджу.

Я выцерла лісточку
ціха слёзы,
Але ж яго няўтульнасць
і адчай
Сказалі – будзь гатовай
у нябёсы…
А мой жа ты лісточак,
пачакай!

Не ўсё яшчэ
я на зямлі зрабіла,
І дабрыню перадала
не ўсю
Дачушцы і сынам.
Дый сілу
Яшчэ я чую
у нагах сваю.

Патрэбна часу
мне зусім нямнога,
Каб памаліцца Богу
за ўсіх нас…
Пажоўклы лісцік
падаў на дарогу,
І восень была
ў росквіце якраз…



# Маё шчасце і лекі

## МАЕ НАБЫТКІ

І раптам развітаюся з жыццём…
Пасля мяне што стане адкрыццём?
Напэўна, добрым словам назавуць,
На вершы можа песні запяюць.
Успомняць аптымізм мой, весялосць
І колькі мне паплакаць давялось?..
Я вам пакіну ўсім сваю надзею
На шчасце, пры любых жыцця падзеях.
Яшчэ прамень у цемры беспрасветнай
І сваю ўсмешку з жальбай непрыкметнай,
Пакіну сваю веру
І любоў,
Дачушку-прыгажуню,
Двух сыноў…

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Пакіну і цябе, каханы мой,
Каб потым зноў сустрэцца
Нам з табой.

* * *

Шэсць руж табе прынесла…
Наўкол – такая ціш!..
Скажы мне, што я песня,
Чаму ж ты ўсё маўчыш?

А матылёк бялюткі
Уецца ля крыжа,
Ці можа так ціхутка
Твая ляціць душа?

А можа з таго свету
Спусцілася яна,
Каб перадаць прывет мне,
Каб знала – не адна.

…Здалёку я прынесла
Тых шэсць пунсовых руж,
Што звесілі над песняй
Пялёсткі сваіх душ.

* * *

Лісцік з дрэва адарваны,
Знік з вачэй, як і каханы.
Ды заўсёды мне здаецца:
Побач сэрца тваё б’ецца…
Гавару з табою ўпотай,
Адчуваю ўсёй істотай,
Што ты ёсць!
Пульсуе памяць –
Ані ўбавіць, ні прыбавіць…
Немагчыма развітацца…
Ты, мой любы, не субстанцыя.
Стаў ты розумам Сусвету –
Я пястую думку гэту
І цябе – заўжды жывога!
Ты са мною.
– Дзякуй Богу!

* * *

Напэўна, я сатканая з кахання,
Кахання да паэзіі, паэта…
Напэўна, кожным нервам
Я прызнанне
Высвечваю,
Дык дзе ж тут да сакрэтаў.

Жыву я  улюбёная у неба,
У сонца, травы, возера без донца,
У пах святочны матчынага хлеба,
У сон дзіцяці…
І ў цябе бясконца.

## ДЫ Я Ж УСЯ ТВАЯ

Ды я ж уся твая,
Такая ж трапяткая.
Ды я ж уся твая –
Другога не спаткала.

Ды я ж уся твая –
Працяг твайго імкнення.
Ды я ж уся твая,
Сатканая з праменняў.

Ды я ж уся твая –
Убачыцца хацела.
Ды я ж уся твая:
Жадала так, ляцела…

Ды я ж уся твая –
Так лёгка дакрануцца,
Ды толькі не твая…
Нялёгка так прачнуцца.

## РАССТАННЕ

Амаль маўчалі.
Хавалі вочы…
Пачуцці – хваляй
На твар жаночы!
Пачуцці – ветрам
На твар мужчыны!
Не кіламетры
Таму прычынай…

Зноў вочы – ў вочы
І рукі – ў рукі,
Нібыта двойчы
Прайшлі праз мукі.

## Я ВЕРШ КАТОРЫ РАЗ САСНЮ

Я верш каторы раз сасню,
Табе аддам яго, як сэрца.
І дзверы насцеж адчыню,
Каб у абдымках мог сагрэцца.

Я нават песню запяю
Не толькі голасам – вачыма.
Убачыш там любоў маю,
Бо не убачыць немагчыма.

* * *

Была жанчына адкрыццём!
І сэрца радасна лунала,
І пачало сваё жыццё
З сімфоніі, што ў небе грала.

А вочы свецяцца да дна,
Як быццам люстру засвяцілі.
Але ж яе не загасілі –
Гарэла люстра да відна.

...Была жанчына не адна.

# РАЗВІТАЛЬНАЕ

Ты ў абдымках каханае спіш,
Шэпчаш словы любві і пяшчоты.
Можа, ў сэрцы тваім толькі ціш,
У маім штохвілінна – журбота.

Мабыць, лепшую выбраў з жанчын,
Мабыць, здрада была і патрэбна.
За цябе я дабаўлю маршчын
І сівых валасоў…
Ты ж, як трэба,
За мяне абдымай і кахай,
І кляніся быць верным навекі.
За цябе праглыну свой адчай.
Наш сынок –
Маё шчасце і лекі.

## НАВОШТА...

Навошта ў лёс мой уварваўся
Натхнёна гэтак, адкажы...
Навошта песняю азваўся,
Што ўжо не ведае мяжы?

Навошта абдымаў з пяшчотай,
І цалаваў усю, як мог,
І словы мне шаптаў употай,
І уладарыў, нібы Бог.

Навошта мне глядзеў у вочы,
Падтрымліваў палёт душы?
Я шчабятала ўдзень і ўночы...
Навошта?
Гэтак не кажы.
На тое, каб была узнёслацсь
І – не завянуць на карню,
Калі ты мне услед са злосці
Прамовіш:
– Іншую люблю.

## ЯК МОГ...

*«Не аддавай мяне, мой мілы...»*
Надзея Салодкая з Гомеля

Як мог аддаць мяне, мой мілы,
Другім вачам,
Чужым вачам?
Як мог аддаць мяне, мой мілы?

Як мог аддаць мяне, каханы,
Другім рукам,
Чужым рукам?
Як толькі мог, скажы, каханы?

Як здрадзіць мог сваёй душы,
Скажы сабе!
I мне скажы:
Як здрадзіць мог сваёй душы?

## ТАДЭВУШУ

Няўжо зусім
Не верыш чысціні
Маёй душы,
Якая побач ходзіць?
Куточак
Свайго сэрца адчыні,
Не хутай раўнадушшам яго.
Годзе!

Павер хутчэй,
Што навакольны змрок,
Які сваё закоўвае
Дыханне,
Твой засцілае
Ненадоўга зрок,
Наступіць яшчэ
Яснае світанне.

І ясны дзень,
Нібыта звон, плыве
Ад Вільні
І да мілай Беларусі.
І зноў мяне
Тваё імя заве…
Я на яго заўсёды
Адгукнуся.

## ЗАМОВА

«Праклінаю я семя сваё
І дзіця, што ты носіш пад сэрцам!»
Мне ж дзіцятка у радасць маё,
Пад крылом маім знойдзецца месца.

Лепш бы ты гаварыць перастаў,
Лепш бы я ў час праклёну аглухла…
Час расплаты яшчэ не настаў,
Яшчэ свечка жыцця не патухла.

## ДА БОГА

Да Усходу станаўлюся,
Сэрцам Богу памалюся:
«Госпадзі, Цябе прашу
За дзіця, што я нашу!
Дай яму прыгожы лёс,
Долю, шчасце каб прынёс.
Дай у творчасці прызнання
І на ўсё жыццё кахання.
Зло яго хай абміне…
Госпадзі, пачуй мяне!..»

* * *

Мужчына,
Які гаворыць
Праўду…
Мне
У тваім сэрцы
Холадна.
Радуюся:
Ты – ёсць у мяне.
Ты – адзіны.
І я сэрца тваё
Напоўню сабой.
І сагрэюся.

* * *

Бліскавіцай спешнаю
Каханне маё грэшнае…
Прабач, мой лёс, прабач,
Калі пачуеш плач!

І толькі сэрца чыстае
Верыць, што я выстаю.
Дало мне неба годнага
Сыночка роднага.

Красуе збожжа спелае,
Ліецца песня. Веру я:
Далоні поўны матчыны
Спадчынай.

## КАЛІ ТЫ ПОЙДЗЕШ ...

Калі ты пойдзеш ад мяне,
Я нават не заплачу, не!
Я ледзь прыкметна усміхнуся...
(Але ж заплакаць так баюся!)
Не ухаплю цябе за рукі,
Каб не адчуў мае ты мукі,
І нават не скажу і слова,
Хаця абняць цябе гатова
І цалаваць, і быць адзінай!
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Ты ж нават не зірнуў
На сына.

*1992*

## КАЛІ Б ТЫ ВЕДАЎ…

*Л. Т.*

А мне цябе не разлюбіць ніколі,
Не прамяняць, не здрадзіць, не забыць.
Маё  каханне незвычайнай долі,
Ніколі сэрца ім не наталіць.

Калі  б ты ведаў лёс свой незайздросны,
Пачуцці б не мяняў і не таптаў.
Калі  б ты ведаў, што вяртацца позна,
Адзінаму б сыночку імя даў.

О, Божа літасцівы!
Каля сына
Цяпер магу я здзіўлена застыць:
Ён – вобраз любага. Навошта ж сілы
Мне свае траціць,
Каб яго забыць?

# ПАД НОВЫ ГОД

Каханы мой
І мой заўжды жаданы,
Ты прыгадаеш нас
Пад Новы год:
Я зазірну у госці
Нечакана,
Калі ты не адзін.
Наадварот,
Пры ўсіх асмелюся
Я дакрануцца,
Калі збярэцца
За сталом сям'я.
Ты так захочаш зноў
Сюды вярнуцца,
Дзе зачакаўся сын цябе,
І я…

## МАТЫЛЁК

Як прывабна віхурыць агонь,
Ён ласкава ў абдымкі заве.
Чалавек падстаўляе далонь –
Чалавеку цяпла не стае.

Матылёк да кастра падляцеў
І спаліў свае крылы ушчэнт.
Цеплыні ці пяшчоты хацеў,
Не паспеў ён сказаць той сакрэт.

Так і я, нібы той матылёк,
Апаліла любові крыло:
Не падняцца увысь, ды здалёк
У вачах маіх ззяе святло.

## АДКАЖЫ

Ты кажаш, што няшчасці следам
Ідуць заўжды і абыходзіць лёс…
Няўжо са мною шчасця ты не зведаў?
У сэрца радасць ці не ты прынёс?

Стаю перад табой, нібы святая,
І слёзы радасці іскрацца на вачах…
Ці не шчаслівая хвіліна тая,
Што пра цябе я мару па начах?

Уся істота да цябе імкнецца.
І ведаю: адзіны ты ў душы.
З крыніцы шчасця хто вады нап'ецца,
Ці не шчаслівым будзе, адкажы?

* * *

Лічыла – ты адзіны назаўсёды.
І марыла і верыла ў свой лёс…
Але жанчыне іншай праз нягоды
Ты свой пярсцёнак вернасці прынёс.

Казалі мне – я прыгажэй, яскравей
І лепшай гаспадыняю слыву…
Сярод жаночай годнасці і славы
Я мудрасць першым словам назаву.

Мо, толькі мудрасць мне і дапаможа
З табою быць штодня і ў гэты час?
Нас разлучыць цяпер ніхто не зможа,
Але ці злучыць зноў каханне нас?

## ТРЫПЦІХ

I

### *Ноч*

Як споведзь для душы,
Я ліст табе пішу.
Дзень слізгануў у хмару…
А я схаплю прамень –
Я ім пішу.

А ты далёка так…
І я лячу да зорак,
Адшукваю сцяжыну
Да цябе сваю.
Мяне касмічны вецер
Нясе, нібыта зорку,
Што блудзіць у аблоках
І знойдзецца ў вяках.

Вось ты са мною побач
І я ў тваіх абдымках,
Нібыта у калысцы.
Я на цябе гляджу…

II

## *Сон*

Такі ты малады,
Прыгожы і рухавы,
Яскрава, як анёл,
Мне нешта гаварыў.
А потым залаты,
Напышлівай аправы,
З чароўным камянём
Пярсцёнак падарыў.

Сын спаў тут у калысцы.
Я здзіўлена глядзела
На камень. І здалося,
Ён з промнямі ажыў.
Ты раптам завушніцы,
Якія так хацела,
З усмешкаю, паціху,
Ля сына палажыў…

Аднекуль людзі, людзі –
Я адчуваю слабасць.
Пярсцёнак той хаваю,
Што ты здалёку нёс.
Хачу упасць на грудзі
Твае, крыху паплакаць –
Ты знік…
Я прачынаюся:
Мой сон жывы, як лёс.

III

## ***Дзень***

Са світаннем, любы!
Я была з табою.
Адчуваю нават
Подых твой цяпер.
Сёння апранаю
Лепшую сукенку,
У люстэрка гляну –
Гэта я, павер!
Што тое люстэрка –
Я ў цябе гляджуся.
Свеціцца ў вачах
Радасць і давер.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Дзень выслізнуў
З-пад хмары…

* * *

*Ю.П.*

У тую ж  рэчку ты не ступіш, не…
За дзесяць год яна сплыла да мора
І змыла хваляй радасць, нават гора,
Каханне зноў прыбіла да мяне.

Яно  святою сталася крыніцай,
Мо, прыйдзецца праз доўгія гады
Стаміцца ад пустэчы…і тады
Ім зможаш ты ў спякоту наталіцца.

*1998*

## МІНУЛАМУ

Старонкі чэрвеня гартаю,
Што малахітам заблішчалі,
І усміхаюся я шчыра
Мінуламу, калі ў адчаі
Танюткія ірвала струны
У сваім сэрцы, аж стагнала,
І плакала. Шукала выйсця…
Мо, й добра, што не азірнуўся
І не пачуў той крык балючы!
Ці мае слых такое сэрца,
Якое і не зварухнецца
Ад слоў прызнання у каханні…
Але ўсміхаюся з падзякай
Табе…
Яшчэ удзячна Богу
За тое, што мой шлях цярністы
Сем год назад з тваім сугучна
Правёў, як дзве струны напятых…
І хоць гучалі ў розны голас,
Я адчувала сэрцам песню
(Напэўна, слых Бог даў музычны).
Здавалася, што мы спявалі
З табою гімны пра каханне.
І я ўсміхаюся: дагэтуль
Струною моцнай застаюся –
Напятаю, спяваць гатовай…

Ды толькі праз усмешку бачу
Цябе парванаю струною,
Што не спявае свае песні.
Я за дваіх цяпер спяваю.
І усміхаюся яскрава
Ўсяму святому. Асабліва
За тое, што маё каханне
Шлях будучыні асвяціла,
Што я іду, лячу, свячуся
Ад пачуцця. І не баюся
Ніякай крыўды, ні спадману!
Бо я шчаслівай застаюся
І сэрцам за цябе
Малюся…

## ЧАКАННЕ

Цябе чакала я вясновым ранкам,
А хмара свет маланкаю жагнала,
Ды сонца супынілася над ганкам,
І промнямі аблокі разагнала.

Зноў лета адгукнулася сініцай.
Былі такія ясныя світанні.
А сэрца ўсё не хоча пагадзіцца
З вясной і летам, і з маім чаканнем.

Апошні ліст трапеча на галінцы,
Схіляюся над восені малюнкам.
А пачуццё на тонкай павуцінцы
Чакае цеплыні і паратунку.

* * *

Любы мой чалавек,
Што самотна табе?
Ты ж спяваў жаўруком
І здзіўляў маё сэрца…
Не замоўкне навек
Твая песня ва мне,
А жывым раўчуком
З майго сэрца пальецца.

Добры, слаўны ты мой!
За пытанне прабач…
З тваім кожным радком,
Што пакінуў ты людзям,
Ажывае дабро,
Што злягло ад няўдач,
І рунее ізноў,
Выспяваць яшчэ будзе.

Я бяру, як усе,
Ад цябе прамяні,
І ад іх пацяплела
На душы і у хаце.
Ад кахання твайго
Я на гэтай зямлі
Аж свячуся уся,
Нібы краска у садзе.

* * *

Кахаю я цябе,
Ты бачыш па вачах!
Кахаеш ты мяне –
Па голасе я чую!
З каханнем у душы
Ісці лягчэй у шлях:
І з гэтым пачуццём
Я днюю і начую…

## ТОЛЬКІ ТАБЕ

Я табе падарыла б у небе аблокі,
Але ў іх цеплыні не хапае.
Я цябе ахінула б усімі вятрамі –
Астудзіць жа пачуцці баюся.
Расцвіла б найпрыгожшаю кветкаю ў садзе,
Але ты не сарвеш, пашкадуеш.
Стала б песняю светлай, пяшчотнай,
ласкавай,
А калі ты яе не пачуеш?
Можа, сцежкай прывабнай,
Прызначанай лёсам,
Рассцяліцца руплівa і мякка?
Роўны шлях жа табе не па сэрцу, здаецца,
Адчуваю я гэта дыханнем.
...Упаду лепей зоркаю з неба начнога,
Асвячу я твой лёс на імгненне.

* * *

Ты далёка недзе,
        але ж побач –
Мае мары,
        як дамоў агні.
Прыязджай хутчэй –
        і знікне горыч,
Пацяплеюць вочы
        у радні.

Зажыве каханне
        ў маёй хаце
У чароўнай яве,
        а не ў сне.
І Бог дасць –
        народзіцца дзіцяці
На уцеху
        і табе, і мне.

* * *

Маці Багародзіца! У хаце
Ля іконы за дзіця малю:
Ад хваробы зберажы дзіцяці,
Што мацней, чым любага, люблю.

Аддаю яму сваё натхненне,
І свой сон, і сэрца, і свой свет…
Свайго саду шчодрае цвіценне
І любові матчынай сакрэт.

Маці Багародзіца! Малюся
За свой край і за яго людзей!
Прасвятая,
Нештачкі баюся,
Што не хопіць часу,
Бо цяпер
Толькі б жыць ды жыць,
Усмешкай цешыць
Любага, адзінага свайго,
Быць шчаслівай самай
Сярод грэшніц
І яшчэ – каханаю яго.

## ЛЮБАМУ

Як зблізіла каханне нас
Пасля няўзгод, пасля адчаю.
Спыніцца заўтра можа час –
Я гэта добра знаю.

І зараз не магу прайсці
З табою побач, прамаўчаўшы.
Даруй, так цяжка адысці
Ад шчасця, некалі спаткаўшы.

Як заўтра я пачну свой дзень,
Калі ты так далёка, мілы?
Каханне нікуды не дзець –
Яно мне прыбаўляе сілы.



# Пегас лёгкакрылы

* * *

Калі душа ляціць у вырай,
Яна спявае, не маўчыць.
Кахаць прымусіць нельга сілай:
Зайграла музыка – скачы.

Калі хто плача – хтось смяецца,
У цемры з'явіцца прамень.
І вецер у спякоту ўецца,
І ноч змяняе ясны дзень.

## ЖАРТ

Чвэрць стагоддзя пішу вершы,
А друкуюць толькі першы.
Каб другі папаў у прэсу,
То сышла б за паэтэсу.

Прачыталі ў Мінску творы,
Былі, пэўна, не ў гуморы.
«Штосьці ёсць, адзначыць трэба.
Няма толькі ў вершах хлеба.
Толькі неба там ды мары
І ні слова пра даляры».
Прычапіўся к мове роднай
Хтось з усмешкаю лагоднай:
– Быць ласкавай можа мова?
Не пішыце – прапанова!
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Адгукнулася пагроза:
Кожны дзень пражыты – проза.

* * *

Чаму цябе раней я не спаткала,
Мой самы блізкі сэрцу чалавек?
Які б я адмысловы лёс саткала,
І як шчасліва пражыла б свой век.

І жонкаю табе была б я вернай,
Вясёлкай ззяла б у тваім жыцці.
Па волі Бога нам з табой, напэўна,
Свой шлях нанова прыйдзецца прайсці.

Я міма пралятаю вольнай птушкай,
Бо ты з другою у гняздзе жывеш.
Ты думаў, што я плачу у падушку,
А я табе спяваю новы верш.

## ПАСЛЯ РАЗВОДУ

…На спатканне
Ён хадзіў з букетам,
Не падорыць зараз
Кветку летам.
Быў жа час:
Аддаць ён марыў сэрца!
Зараз дзеліць
Лыжкі і відэльцы.
Ля яго яна лятала
Птушкай.
Зараз мокрая
Ад слёз падушка.
І жыве ён –
Ні сабе, ні людзям…
Няўжо нехта
Яшчэ плакаць будзе.

## ЖАРТОЎНАЕ

Цвіце магнолія ўначы,
Дурманіць голавы да рання…
Ты лепей побач памаўчы,
Але не здзеквайся з кахання.

Сагнуўся месяц паглядзець
На нас з табою, як на цуда…
Прыйшлося побач пасядзець,
А знадаеў, нібы зануда.

Навошта ты сустрэўся тут –
Пусты, збянтэжаны ад гора?..
Сама ўцякла ад гэткіх пут,
А сёння стрэла іх ля мора.

## ГЕРОЙ

– Ну трохі паламалася, дый годзе!
Спусціцца на зямлю даўно пара, –
Злуецца кавалер, што ў карагодзе
Спаймаў мяне, давёўшы да двара.

– Каму цяпер патрэбны твае слёзы?
Няўжо табе яшчэ сямнаццаць год?
З табою, як з дзяўчынай ля бярозы,
Збянтэжана стаю, як ідыёт.

Рукой махнуць мне,
Ці з табой абняцца…
– Ну што тут зробіш? Прыкра мне самой.
Напэўна, лёс працягвае смяяцца:
Што ні герой – з абрыдлаю душой.

## ГЛЯДЗІ

Глядзі цяпер услед…
Ты ж думаў – я не пара.
Упэўнены лічыў:
Нікуды не ўцяку.
Я ведаю, мой свет,
Ты пра мяне не марыў.
Ну што ж, табе відней.
Давай, халасцякуй!

Цяпер і я гляджу
Без смутку, без трывогі,
З усмешкаю кажу:
«Быў любым ён, дзівісь!»
Па той траве хаджу,
Расой дзе мыла ногі,
Ды не знаходжу слоў,
Так, як і ты калісь.

* * *

Дзе ты, любы, заблудзіўся,
На спатканне не ідзеш?
Можа, ты заганарыўся,
Напісаўшы новы верш?

Можа, ты мастак? Малюеш?
Ці кандытар, дык пячэш?
Ці вядзьмар, і так калдуеш,
Што і сам не разбярэш?

Быў бы доктар! Пры рэнтгене
Можа б, высвеціў любоў?
Усё роўна – Коля, Гена…
Абы радавацца зноў.

* * *

Дык няўжо ты быў так рады
Гэтай клетцы залатой?
А цана была ёй – здрада
І палон жанчыны той.

Вось і стаў ты папугаем,
Салаўём жа марыў быць.
Як крылом махаць адчаем,
Цяжка сэрца прывучыць.

Я ж цябе яшчэ кахаю,
Хай і на сваю бяду.
І на боль свой не звяртаю,
Ратаваць цябе іду.

* * *

...Як упала пажоўклае лісце,
І здалося табе: няма выйсця
І ратунку няма ад кручыны,
Тут паслаў табе лёс твой –
Жанчыну.
Каб цяпло яе ласкі ты зведаў,
Разам з ёю вячэраў і снедаў.
Каб здзіўленнем высвечвалі вочы –
Калі стан абдымаў ты дзявочы,
Кожны рух яе трызніў каханнем,
У адказ – не гарэў ты прызнаннем,
Не прамовіў пяшчотнага слова,
А яна салаўём стаць гатова
І так верыць табе, нібы Богу,
Ды з надзеяй глядзіць на дарогу...
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
На кані не аб'едзеш свой лёс,
Гэта праўда, хоць слепні ад слёз.

*1989*

## ВЯРТАННЕ

Дзень добры!
Не згубілася, прыйшла!
Ты ж зваў. Чакаў?
Чаму ж такі нясмелы?
Няўжо я позна
Да цябе прыйшла,
І ты ужо сарваў
Свой яблык спелы?

Гляджу я ў вочы:
Шчасця не відно!
Ты дзе згубіў яго?
А не згубіць пакляўся!

Дык што стаіш?
Хоць рукі працягні!
Насустрач крок зрабіць –
Ці здагадаўся?..

## СКАЗАЎ МНЕ…

*І. Б.*

Сказаў мне:
«Досыць тваіх вершаў.
Больш, паэтэса,
Не пішы».
Сказаў аб гэтым
Ён мне першы.
Прабач,
Апошні верш душы.

Сказаў мне:
«Нечага глуміцца
Над тэлефонам
Ноч і дзень:
Пасля размоў тваіх
Не спіцца…»
І я маўчу,
Нібыта цень.

Што ж не сказаў:
«Кахаць не трэба?»
Мо, перастала б
І кахаць!
Ды нельга ўсім
Аблокам неба
Праменні сонейка
Заслаць.

* * *

Што сорак год, сівыя скроні,
Калі трымаю я ў далоні
Руку тваю і чую сэрца,
Якое да мяне імкнецца.

У сорак год з табой сустрэцца!
Ужо нікуды мне не дзецца
Ад воч яскравых, ледзь з блакітам.
Хвіліна шчасця не забыта.

Што сорак год, гады – не гэта,
Калі табой душа сагрэта,
Калі нясцерпны жар дрымоты,
Калі так хочацца пяшчоты,
Ад панядзелка да суботы.

## ІВАНКУ

Падару Іванку
Неба без маланкі,
З чыстае крыніцы
Дам папіць вадзіцы.
Павяду спаткацца
З зоркай-заранiцай…
Запяе Іванка
Тады калыханку:
– Няма на зямліцы
Лепшай маладзіцы.

## У ЦЫРУЛЬНІ

Я. Нажніцы, пэндзаль, фарба.
Майстар. Словы. Валасы…
Ліст паперы, сшытак скаргаў
І люстэрка для красы.

Грэбень, чуць жывыя кветкі,
Кубак, вата, фен, ручнік.
Пралятаюць мухі зрэдку,
Таракан прапоўз і знік.

Вушы, нос, усмешка, вочы,
Шыя, плечы і пагляд…
Я збіраюся у Сочы?
Не! Вярнулася назад.

# ПАМОЧНІЦА

*Дачушцы*

Каця свой прыбрала ложак,
Цацкі пазбірала ў кошык,
Хусткай падмяла падлогу –
Расце матчына падмога.

Каця выцягнула шыю:
– Мама, гузік дай, прышыю.
– Яшчэ рана табе шыць,-
Кажа маці.
Ды крычыць:
– Шыць хачу! –
Ёй Кацярына.
– Дайце мне іголку,
Дайце!
– Што ж, бяры,-
Сказала маці
Неслухмянаму дзіцяці.

Не паспела рот закрыць,
Чуе, Каця верашчыць.
– Вось што, мілая дачушка,
Непаседлівая птушка.
Ты яшчэ зусім малая,
Бо няма і трох гадочкаў.
Наша Каця пачакае,
Покуль вырасце з сарочкі.

Калі стане гадкоў болей –
Тады, можа, і не ўколе
Кацю хітрая іголка.
Навучыцца трэба толькі,
Як іголкай гэтай шыць…

Каця слухае, маўчыць
І ў акно ужо глядзіць:
Там вясёлыя арэлі
Да самых нябёс ляцелі.

* * *

Жыта пасля зімняй сцюжы
Кожны лісцік разгінае,
Ажно сохне кветка, тужыць,
Што ніхто больш не зрывае.

Рэчка Сож пад коўдрай шэрай
Бераг моцна абдымае:
Ранак з лесам заімшэлым
Іх ад сонейка хавае.

Лёг туман, накрыўшы сонца,
Як смятана зверху шклянку.
Ды праменьчыкі да донца
Акунуліся ў смятанку.

# ЧАРОЎНЫ СОН

У нябёсах плыве калясніца,
Зіхаціць, мільгаціць бліскавіцай.
Зоркі збоку, як пырскі вадзіцы,
Коннік гэткі, што не надзівіцца:
Словы з вуснаў ягоных – крыніцай,
З якой хочацца ўдосталь напіцца.
Сказ ягоны – адны небыліцы
Для адной для цябе ўсе,
Як быццам…
Ты не слухай яго, маладзіца,
Гэтак можна і ў сне
Заблудзіцца.

# НЕСЦЕРКА

*Жарт*

Несцерка, герой былін, –
Рэжысёр Валера,
Ён яшчэ паэтам быў,
Лепшым кавалерам.

А як ён любіў скакаць,
Падхапіўшы дзеўку,
І пры гэтым мог спяваць
Хітрую прыпеўку:
«Ой, прабач, была прычына,
Што я ўчора не прыйшоў:
Муха свечку патушыла,
Дык штаноў я не знайшоў».

Гэта што ж ты нарабіў:
Ты – амерыканец?!
Якім Несцеркаю быў,
Там ты – галадранец.

Што ў Амерыцы забыў,
Адкажы, Валера?
І што мне адной рабіць
Тут, без кавалера?

* * *

З каханым не спрачалася,
Пайшла, не азірнулася,
Насустрач лёсу добраму –
Не верыцца яму.

Іду і усміхаюся,
Надзеяй акрылёная!
І быццам бы для радасці
Амаль няма прычын.

Нікольki не губляюся,
Гляджу я на здзіўлёныя
Усмешкі і адказваю
На позіркі мужчын.

Дык што са мною сталася,
Што стала я прывабнаю,
Загадкаваю стала я?
– Таму што я люблю!

# ДУРАКАВАТЫ

*Жарт*

Суцішся, сэрца. І не плач.
Ды  за каханне мне прабач,
Ты ж адчуваеш – ён не мой,
Хоць і абдыме раз парой.

Брыду за ім, закрыўшы вочы,
Ці памяць страціла аднойчы?
Не здзіўлены каханнем ён,
Нібы узяў мяне ў палон.

Я сваё сэрца апраўдала,
Што закахалася няўдала.
Я, сапраўды, не вінавата,
Што ён такі дуракаваты.

## КОТКА

Як пад ногі вожыка,
Кінуў мне праклён,
Ён ва мне – бы ў кошыку,
Жыў да гэтых дзён.

Я купіла котку,
Хай са мной ляжыць.
Не ганю сіротку,
Колькі будзе жыць.

Акаціла котка
Коціка – ура!
Злезла ўся брыдота.
Што ж, даўно пара.

* * *

Хутка як бягуць гады,
Бы між рук вадзіца.
Хлопцу усяе бяды –
Трэба маладзіца.

Сцежкі заліло вадой,
Зараслі калюжы.
Скіс у кубку сырадой,
І на вербах грушы.

Вішні хутка адцвітуць,
Здымуць завушніцы…
Глянь, няўжо сваты ідуць,
Сустракай, дурніца!

# СЁННЯ

*Чытаючы Д. Карнегі*

Сёння адганю трывогу
І любое пачуццё.
Атрымаю перамогу
Над сабою і жыццём.

Сёння я пачну з зарадкі
І патроху есць і піць.
Давяду ўсё да парадку,
Буду ўсіх людзей любіць.

Буду, буду, не забуду:
Шчодра буду ўсіх хваліць.
А чытаць я больш не буду –
Нешта галава баліць.

## ШЧАСЦЕ

Шчасце скача – Пегас лёгкакрылы
І сляпы ад свайго Шляху Млечнага…

Зайздрасць хусткаю зорнаю плечы
Ахінула – Парнас услаўляючы.

Рэўнасць вушы свае натапырыла,
Ловіць словы, ажно захліпаецца.

Злосць смяецца і кавай частуе,
І не цукар, а соль падсыпае.

А нянавісць, як хмара спяшаецца,
Абыйсці сваёй шчодрасцю зайздрасць.

Помста, быццам сабака на прывязі,
За нянавісцю ўсюды бадзяецца.

Роспач плача над шчасцем знясіленым,
Бо ніякага выйсця не бачыць…

Калі шчасце шалее ад рэўнасці,
Злосць з нянавісцю ходзяць да роспачы,
Следам помста ад брэху заходзіцца,
Меціць зайздрасцю след і ваколіцу…
Памаліся,
Няхай супакояцца.

* * *

– Як добра, што каровы не лятаюць, –
Сказаў дзядок, смяшынка у вачах…
– Каровы ежу тонамі з’ядаюць,
А зерня трошкі падзяўбае птах…

## ЗАЙЗДРОСНІЦА

Я ведаю зайздросніцу-жанчыну,
Якую не мінула прыгажосць...
Трымае, як гарэлую лучыну,
Яна у сваім сэрцы толькі злосць.

Для зайздрасці заўсёды ёсць прычына:
Сукенка новая, ці макіяж,
Або не з ёю прыгажун-мужчына –
Заходзіцца ад дыму сэрца аж!

Калі другую побач паважаюць
За розум, сціпласць, ці за цеплыню –
Лучыну ў сэрцы нібы распаляюць,
Вось не бывае дыму без агню!

Заўсёды ёсць зайздросніца-жанчына,
Якую не мінула прыгажосць.
Але ў мяне такая вось карціна
Агіду ў сэрцы выклікае штосьці!

* * *

*А. Дольнікаву*

Раней бы ў душы крыўдавала,
Што стала насмешкай для вас,
А зараз удзячнаю стала –
Прайшоў ганарлівасці час.

На рукі гляджу рэжысёра,
Абразы прымаю, як верш:
Табою была я учора,
Лісілівасць любіла найперш.

А сёння вібрацыі сэрца
Стараюцца дух не згубіць.
…Здаецца, яшчэ давядзецца
Па-іншаму нам гаварыць.

*6.04.1998*

# КРЫТЫКУ

Згодна, я ўсяго – пасрэднасць,
Вершы – стан маёй душы.
Няма ж зайздрасці –
На беднасць
У сваёй не адкажы.

* * *

Не верыш у каханне? Божа мой!
А я даўно заву цябе каханым…
Цяпер і мне не верыцца самой –
Каханы мой! І мой – неспадзяваны.

Няўжо не бачыш па маіх вачах,
Як свецяцца яны?! Няўжо дарэмна?
Кахаю так аддана, проста жах, –
Табе ж мяне і слухаць непрыемна.

І голас мой няўжо не вабіць слых?
Узрост мой не пасуе да усмешкі?
«Не веру у каханне!» – Як пад дых.
Не азірнуўся і падыбаў сцежкай.

Зусім не верыш? Што ж пайшоў тады
За мною, нібы здань, пры першай стрэчы?
Мяне ты вывеў за руку з бяды,
Што ўсе гады са мной была, дарэчы.

Няўжо сягоння зорны час настаў
Для здрады і для нашага расстання,
Калі ў пачуцці верыць перастаў,
Калі не бачыш ты майго кахання?

## ТАНГА

Праз гады сустрэліся
З табою выпадкова,
Нібыта на шчасцейка
Выпала падкова.

Кахала што ёсць моцы…
Не зводзіў ты вачэй,
Мой самы лепшы хлопец –
Бяссонніца начэй.

І вось сустрэча зноўку
Нечаканая.
Як і тады ў цябе я
Закаханая.

Лаўлю твой позірк,
Як галінку вецер.
Адзіны ты
У цэлым белым свеце…

Удзячна я,
Што ты не адвярнуўся.
Ды бачу, што другой ты
Усміхнуўся.

Я позірк той
Пазнала праз гады –
Ты закахаўся зноў,
Як малады.

Мне танец двойчы
Твой вярнуў пагляд:
Пустыя вочы –
Мяне згубіў і рад.

Мой сон дзявочы!
Як я думкай баюся,
Што я аднойчы
Зноўку закахаюся.

## КЛЮЧЫ АД ШЧАСЦЯ

Ключы ад шчасця
Ў кожнага свае,
І кожны іх
Па-свойму ужывае:
Адзін шчаслівы тым,
Што аддае,
Другі, што забярэ
І прыхавае.

Шчаслівы нехта,
Калі дождж ідзе,
А хтось кляне надвор’е
І злуецца.
Адзін за шчасце
Ўдзячны і бядзе,
Другі ад страху
Ў золаце трасецца.

Вось ён, напрыклад,
За сяброўку рады,
Яму не трэба
Кралі галівудскай.
А гэты ухапіўся
За пасаду,
А я – за сваю
Мову беларускую.

## ХАЙ КАЖУЦЬ…

Хай кажуць,
Што прайшлі гады
Для нашага
Кахання.
Хай пасмяюцца –
І тады
Чакаць буду
Прызнання.

Хай сочаць,
Шэпчуцца няхай,
Злуюцца,
Нават хлусяць!
Маё каханне,
Так і знай,
Замоўкнуць
Іх прымусіць.

* * *

Ехаць не баюся:
Вельмі спадзяюся
На зямліцу-маці,
На ікону ў хаце,
На аблокі, вецер
І на ўсё на свеце.

Словам не карыла,
А душу адкрыла:
Сэрца у даверы –
Вершы на паперы.
Стрэча на прадвесні
І жыццё, як песня.

Болькі загаіла –
Скуль бярэцца сіла!
Сэрца зноў трапеча
Па табе, хлапеча…
Кланяюся Богу:
Дзякуй за падмогу!

* * *

Хітруеш – гэта ведаю даўно,
І як жа небарака прамахнуўся,
Ды уступіў знянацку у дзярмо…
Што ж, і яно, нібы вадзічка з гуся.

Мая душа табе не па зубах,
Бо я святлею думкаю пра Бога,
Бо вера у Яго – надзейны дах,
Хоць да малітвы доўгая дарога.

Я спапялю твае праклёны ўсе,
Для тваіх думак што былі нектарам,
Ляжыць мой шлях па камнях, ці расе,
Але ж да Бога я заўсёды – тварам.

* * *

Я марыла і дні, і ночы,
Каб зазірнуць табе у вочы:
Ці сапраўды яны ілгалі,
Як у пяшчоце абдымалі
З чароўнаю спякотнай сілай
Твае рукі…
О мой мілы!
Напэўна, я таму віною,
Што ты сягоння не са мною,
Што не знайшло маё каханне
У тваім сэрцы хвалявання.
Але я на сустрэчу еду,
Нібы па леташняму следу.
І прашу употай Бога:
«Шчасця дай хоць ля парога…»
Потым, як у вочы гляну, –
Расквітнею ці завяну…

* * *

…Дзякую, што марыш
Аб каханні,
Ды тваё
Спазнілася прызнанне.
І таму кажу табе я – не.
І прызнаюся
Таксама шчыра:
Час прайшоў,
Калі лятала ў вырай,
Адлятай, браток мой, без мяне.

# СПАДНІЦА

Заглянуў у вочы
Сонечны прамень.
Пасля доўгай ночы
Я вітаю дзень.

Сон прысніўся нейкі,
Што кахала ўпотай.
Зноў закрыла вейкі
Я ад асалоды.

А думка – хутчэй,
Як бы не спазніцца!
Трэба мне яшчэ
Нацягнуць спадніцу.

Я спадніцу трохі
Падыму вышэй –
Мільганулі ногі,
Ажно да вушэй.

Якою дурніцай
Я была тады.
Мільгаюць спадніцай
І мае гады.

Праз гады у восень
Адляцелі вёсны:
Сівізна, бы восы,
Упілася ў косы.

Позірк мой,
Як просінь –
Раўнадушны зоўсім…
Можа, прыпыніцца?

Якою дурніцай
Тады была я!
Кароткай спадніцай –
Маладосць мая.



# Слухаю рэха

## СУЗОР’Е ЭТЫКІ ЖЫВОЙ

* * *

…Жыццё не абарві дзіцяці –
Ён перад ім не вінаваты.
Будзь мудрай і цярплівай, маці,
Бо хопіць хлеба, хопіць хаты.

* * *

…Спыніць дзіцяці зараджэнне –
Не трэба розум і геройства.
Дзіцяці – цуд! Нібы адзенне
Яго на сметнік? То ж забойства!

* * *

…У добрую часіну светлую,
Калі ты са сваім дзіцём,
Свой напаўняеш розум светам.
А яго сэрца – пачуццём.

* * *

…Прытулак для адвагі – гэта сэрца.
Вазьміце маці родную. Яна
Ахвярай стане, толькі не здаецца:
Табе сваю любоў аддасць спаўна.

* * *

*«... Ты – радасць*
*касмічнай творчасці...»*
А. І. Рэрых

...Маці Міру,
Маці Міру!
Прымі нашых душ
Лёгкакрылы вырай.

Дзякуй, што шлях
Указала Ты нам,
Крылам нашым
І нашым вачам.

Наш прыняла Ты
На плечы цяжар,
Сумам прыкрыт,
Як хусцінкаю, твар.

Мы Табе молімся:
– Маці, зірні,
Як разгараюцца ў цемры
Агні!

Знаем, што позірк Твой
Свеціць ярчэй,
Але ж мы не станем
Адводзіць вачэй.

Просім Цябе мы,
І молімся шчыра,
Маці Міру,
Маці Міру.

* * *

...Калі ты вырашыш –
Няма наперад шляху!..
Энергію і моц
Ты закуеш свае.
Пры гэткіх ланцугах
Забудзеш пра адвагу,
Адвернуцца сябры...
Бог моцным падае.

Табе адчаем
Больш не апраўдацца:
Рух прыпыніў
І рукі апусціў?
Прывід твой змрочны
Будзе зданню звацца,
Нікчэмнасцю сваёй
Ты не здзівіў.

* * *

...Не зазываюць сілаю гасцей,
Але прыняць дастойна госця трэба...
Слабы ў маркоту па́дае часцей,
А моцны пазнае
Бяскрайнасць неба.

* * *

…На сэрцы цемрадзь –
Цяжка не стаміцца.
Не разгубіцца,
Не забыць спакой.
І не дазволіць
Над душой глуміцца –
Я гэта здолела,
Хоць я і не герой.

* * *

…І ненавіснікі пакутаваць могуць
І ў гэты момант ачышчацца духам.
І душы іх адшукваюць дарогу
І напаўняюць дзень пражыты рухам.

Што ж, лепей, калі мукі ачышчаюць,
Чымсьці у цемры раўнадушна гніць.
Нянавісць у любоў ператвараюць
Пакуты нашы…
Як іх не цаніць?

* * *

…Дваістае – разгубленасць, цікаўнасць…
І забыццё – усё недасканаласць…
Прыняць за здраду нават позірк можна
І пацалунак. – Выбірае кожны.

* * *

…Лепш не прыблізіцца, чым здрадзіць,
Паабяцаўшы – адступіць.
Чым долю сына змалку страціць
І сэрца сэрцам спапяліць.

* * *

…Магутнасць невычэрпная – у руху…
Віхор – бунтар непаслухмяны духу.
І кропля, як слязіначка крыніцы,
Зарніца – толькі вока навальніцы,
Цікуе, як маланка і пярун.
Спрачаюцца. Снег – холаду вястун,
Які растаў, як у юнацтве мара.
А слова – свет,
Ды снегу ён не пара.

* * *

…Ці можам мы
Настаўнікам лічыць,
Хто у душы
Не бачыць прасвятлення?
Дзяцей яму ці можна
Даручыць?
Прыгнечаны ці дасць
Ім захапленне?

* * *

…Любоў не ведае мяжы,
Таксама, як і вера.
Калі іх маеш, зберажы.
Сэрца – кут даверу.

* * *

…Не скрыпка венік – не заграе.
Не засмяе дзіцяці ёг…
Не смехам сэрца напаўняюць:
Што мудрасць?
– Радасць! – вучыць Бог.

* * *

…Малітвы словы гавары,
Малітву Богу падары:
Няхай святкуе угары
Анёл…
Што тут не гавары,
Ахоўнік ён твой, праваднік,
А ты заўжды яго
Даўжнік.

* * *

…Утрымлівайце абурэнне,
Няхай спакой амые вены,
Душы дасць космас абнаўленне…
Бо лепей скача конь без пены.

* * *

…Не ў хуткасці прыкметы працы,
А толькі ў якасці – дзівіся.
І каб у бездань не сарвацца,
Назад на вучня азірніся.

* * *

…Вялікае вязенне для Тварца –
На папялішчы горад будаваць.
Старому – лахманамі ад старца,
Як у віры, у вечнасці знікаць.

* * *

…Калі нясеш святло –
Заве цябе дарога.
Назад лепш не глядзець.
Дагоніць лёс і там.
Аддай без жалю дар,
Калі ў душы трывога,
Змяні, калі жадаеш,
Свой лёс нялёгкі сам.

* * *

…Нябеснае адзенне апранаем:
Хто больш аддасць, той болей атрымае…
Любі няшчасных і шкадуй малых,
І, можа, пашкадуе хто тваіх.

* * *

...Ад вялікага нікчэмнасць
Так адрозніць і не змог.
Думаў скарб знайшоў,
Ды ў цемры
Камень прывязаў да ног.

* * *

...Як кожны чалавек, так і краіна,
Прыроды непаўторнае яўленне.
Энергія без прынцыпаў павінна
Заўсёды быць прычынай разбурэння.
Таму, калі сыходзім мы з арбіты,
Сябе саміх даводзім да знішчэння.

* * *

...Ты не смуткуй у горы аб мінулым.
Памылкі ёсць? Ды караван ідзе...
І знойдуцца заўсёды людзі чулыя,
Вучыся усміхацца і ў бядзе.

* * *

...Любоў і вера – дух і пачуццё,
Бальзам для сэрца, абярэг для дома.
І словы мудрых праз усё жыццё
Нам як малітва Госпаду вядома.

* * *

…Каб цемра не блытала
Струны душы,
Як вока, ты веру
Сваю беражы.
У Госпада вер –
У адзінага Бога,
З малітвай святою
Ідзі у дарогу.

* * *

…Шлях выбірай
Ці месяца, ці сонца.
Ад сонейка здаецца
Свет бясконцым.

А месяц, як прывід,
Усё смяецца.
І шлях вам сцежкай
Вузкаю здаецца.

Хто перастрэне вас на ёй –
Іуда?
А вы чаго чакалі,
Можа, Цуда?

* * *

...Жыццё зямное, як імгненне,
І мы скідаем праз гады
Свае ваганні, як адзенне.
Як дрэва спелыя плады.

* * *

...Пражыць жыццё...
Нібы шчаслівa
Прайсці праз бездань
Па струне:
Прыгожа, беражна, імкліва,
Як быццам крылы на спіне.

* * *

...Ідзі і веру сатвары –
Шукай гармонію бясконца.
Туман паўзе ўнізу гары,
А на вяршыні свеціць сонца.

* * *

...Людское шчасце ў прыгажосці:
А творчасць – адраджэнне духа.
І ловіць нават на пагосце
Мелодыю кахання вуха.

* * *

…Як певень статак
Голасна склікае,
Ды ранак вусны
Ўсмешкаю кранае!
Прамень, як слуп,
Нябесны храм трымае…
І творыць Бог!
І ўсіх нас запрашае!

* * *

…Злачынства цяжкае –
Над думкаю насілле…
Але ж і немагчыма дапусціць,
Што ў ёй нянавісць
Распраўляе крылы
І да твайго дзіцяці даляціць.

* * *

…Музы́ка нават гук
Расціць, як кветку, стане,
Бо ўдалы просіць лук,
А птушку сам дастане.

* * *

…Марнее чалавек паціху,
Калі ў думках стынь і скруха.
Калі да вас прыходзіць ліха,
Яго не выганіш, як муху.

А, можа, лёс праявіць літасць
І зберажэ і вас, і дом,
Пакуль ганяецца сярдзіта
Сабака за сваім хвастом.

* * *

…І смерць не больш, чым стрыжка валасоў –
Мы аддаем матэрыю з палёгкай.
Высокі дух заўжды ляціць стралой,
А цёмны дух ідзе сцяжынай крохкай.

* * *

…Узваж у сэрцы, зразумей раптоўна:
Ці думка творчая цябе прыстойна –
Каштоўнасцей праходзяць так адборы,
Бо думкі не ўміраюць у прасторы.

* * *

…І жэмчуг можна ажыўляць,
Не адчуваючы стамлення.
Ім можа нават сэрца стаць,
Калі ёсць радасць захаплення.

* * *

…Магчыма ўсё! – паверце Богу.
Нямоглага ў маркоце карані.
Даверцеся душы – і у дарогу…
І ногі не завязнуць у хлусні.

* * *

…Дасціпным словам
Не узыйдзе здзек.
У жартах мудрым будзь,
Не блытай з'яў.
Знявагу не даруюць
Табе век:
Знявага – гэта пастка
Для разяў.

* * *

...Бог забярэ сабе ваш дар.
Ён варты вашага сумлення.
Аддайце вашых вершаў жменю,
Калі вы ім не гаспадар.

А, мо, жаданне закапаць
Свой дар захочацца аднойчы?
Тады святла вам не спазнаць,
Бо служка цемры вы і ночы...

* * *

...Бог вучыць мудрасці людзей
І да Хрыста любові ў сэрцы.
А шчасце прыйдзе, хоць падзей
Нямала пройдзе. Толькі верце!

* * *

...Не вярнуць нам таго, што ўпусцілі,
І любоў за грашы не купіць...
Храм маўчыць у цішы – звон разбілі.
Але ж веру не проста разбіць.

* * *

...Заўсёды шлях дабра не песнапенне –
Малітва, праца і сумленне.

* * *

…Шчасліва сярод злых і цёмных
Нясіце каганец, нібы куліч…
Калі ўпадзе ружы пялёстак –
Адчуе ў гэтым нехта кліч.

* * *

…Ці лісце віхрам пранясецца,
Ці дождж застукае ў акно,
Ці пасля слёз дзіця смяецца,
Ці снег ляжыць, нібы радно,

Ці лёд растопіцца пад сонцам,
Ці птушка трэллю запяе,
Ці хвалі змыюць жаль да донца –
Сам Бог нам знакі падае.

* * *

…Не слухай тых,
Хто абы-што гаворыць,
Заўчасна
Пасівеюць валасы.
Дыханне любага
Табе спакой падорыць,
Прыслухайся
У начныя галасы.

* * *

…Указаны пяць якасцей
Дабра:
Спачатку мы напішам так:
ІМКНЕННЕ.
Затым дабавім
ЗДОЛЬНАСЦЬ І СУМЛЕННЕ,
ЖАДАННЕ ПАМАГЧЫ
(Без прысваення).

Хоць вельмі цяжка
Задарма рабіць,
Але калі душа
Дабро прымае,
То зможа пра сваю
КАРЫСЦЬ ЗАБЫЦЬ
І веру сваіх продкаў
Захавае.

* * *

…Даўмейся сам:
Не з мёртвымі ісці…
Лепш паспяшай
Скарб у душы знайсці.

Чымсьці драмаць
У нежывым чаканні,
Затым сабе
Адшукваць апраўданні.

* * *

…Не кляніце ніколі нікога,
Не зласлоўце, хай ворагі кпяць –
Бо ўсе словы даходзяць да Бога,
А затым бумерангам ляцяць.

* * *

…І не трэба дарэмна зласавацца:
Ноч заўсёды цямрэчай пыхціць,
Але ёй анідзе не схавацца –
Дабрыня светлай зоркай зіхціць.

* * *

…Свяшчэннае паняцце Шамбала,
Паняцце чысціні, паняцце свету,
Дом Бога – непрыступная гара.
Ён падуладны хіба што паэту.

* * *

…Пачуе неба нават безгалосых.
Мы ж думаем, што толькі крыкуноў…
Зрабіў Бог сувязь – дзетак і дарослых –
Як міжсусветных вестуноў.

* * *

…Лічыце выпадак наканаваннем,
Які прадугледжаны Богам, –
Старонкай будучага…
Распазнанне
Нябачна яшчэ за парогам.

* * *

…Меч загартоўваюць і дух –
Агнём.
Затым вадой халоднай – першы.
І дух становіцца мацнейшы,
Калі агонь душы патух,
Пад холадам зняважы…
Але прайшло імгненне –
І робіш крок у захапленні.
Свой першы крок адвагі.

* * *

…Можа, ў чалавека ёсць прызванне,
Схільнасць гэту іншым пакажы.
Не пярэч любому начынанню –
І не загасі агонь душы.

Полымя ўсё роўна не пагасне.
А табе азвецца, як зрабіў.
Лёс пазней табе пакажа ясна –
Дапамог каму, каго забіў.

* * *

…Слухайся сэрца ноччу і днём
І напаўняй дарам Божым.
Радасці слёзы ззяюць агнём
Нават у цемры варожай.

* * *

…Мінулае нам аддаляе час,
А будучыня прыбліжае…
Даў Бог нам радасці запас
І шчасця.
Хто не заўважае?

* * *

…Як думкі мімалётныя людзей,
Так кнігі кожны выбірае…
Пыл кніг шаноўны, пыл падзей,
Але над пылам дух лунае.

* * *

…Прайду цераз агонь і дым.
Адкрыю таямніцу:
Дух веры вечна малады
Бруіцца, бы крыніца.

* * *

…У планах Бога можна ўразумець
Сусвету ісціну, высноў магутнасць.
Ды толькі таму сэрцу, што гарэць
Працягвае і ловіць слых сугучнасць.

Аддам Табе любоў сваю і сэрца:
Вазьмі і уратуй увесь Сусвет.
І, можа, зможа ля Агню сагрэцца
Той, для каго цяпло даўно сакрэт.

* * *

…Збірайцеся да храма разам
Каб памаліцца, памаўчаць.
А у цішы растуць тым часам
Крылы духа, каб лятаць.

* * *

…Не плач перад растаннем,
Май цярпенне.
Яго не абыйсці
Перад сустрэчай.
Для будучага нам
І разуменне.
А памяць
Для мінулага, дарэчы.

* * *

…Злачынства цяжкае –
Над думкаю насілле…
Але ж і немагчыма дапусціць,
Што ў ёй нянавісць
Распраўляе крылы
І да твайго дзіцяці
Даляціць.

* * *

…Якою б мовай ні валодаў,
Якім бы шляхам не ішоў,
Які б не адчуваў ты водар,
Ці раптам скарб які знайшоў,

То супыніся на імгненне,
Дай сэрцу абляцець абшар,
Набрацца цеплыні, натхнення,
І выпраменьваць Божы дар.

*1992*

## ДАЖЫНКІ

* * *

Спяшаемся куды?
Да шчасця – ты,
Ён – да бяды.
Услед – трывогі пачуццё…
І так у спешцы
Ўсё жыццё.

* * *

Пасля ліўня у акно
Сонца  зноўку выглядае.
Раўчуком – любоў вясной,
Але ўвосені палае.

* * *

Слава абыйшла,
І  дзякуй Богу.
Быў жа час –
І я яе чакала.
Карабель пазваў мяне ў дарогу,
Ды прыбіла лодкай да прычалу.

* * *

Навошта замуціў калодзеж,
Нядаўна ж піў з яго яшчэ?
Ты зараз хутка міма пройдзеш,
А вернешся, як прыпячэ…

* * *

Пакасілі ў поле травы,
Пахне сена маладосцю.
А мае гады – атавай
Зелянеюць сумна штосьці.

* * *

Ён песен не пяе?
Не дзіўна…
Не любіць
Мовы роднае свае?
Тут можа быць
Адзіная прычына,
Што проста
Ён не ведае яе.

* * *

Вятры мае калісьці адшумяць,
Адплача клён, нібы слязою, сокам.
А промні будуць лісце цалаваць,
Як і тады, перад апошнім крокам.

* * *

Цяплом зямлі сваёй
Спакон вякоў
Ты, Беларусь,
Сыноў сваіх здзіўляеш.
Паэзіі акрыленым радком,
Як водарам, іх душы
напаўняеш.

* * *

…На шчасцейка я не раблю зарок,
Бо ведаю: яно яшчэ блукае.
І хоць за ім я не прыспешу крок,
Я веру, што яно мяне спаткае.

* * *

Нада мной лунаюць песні,
І я іх амаль запела:
Ручаінай на прадвесні
Забруіла маё цела.

* * *

Халодныя блукаюць цені,
І хоць на вуліцы мароз,
Ды веснавыя летуценні
Пацалунак твой прынёс.

* * *

…Марыла. Тваёю быць хацела,
Ашчаслівіць і цябе, і лёс.
Я на крылах да цябе ляцела,
Ты ж свой лёс
Зусім другой панёс.

Ты не мой:
Да болю горка-горка.
Усё роўна сэрца аддаю –
Хай засвеціць пуцяводнай зоркай,
Не дай Бог, як будзеш на краю.

* * *

Якім магутным дубам ты здаваўся,
На самай справе – гнуткі, як хмызняк.
Я марыла, каб песняю азваўся, –
Ды ты спяваць не можаш аніяк.

* * *

І болькамі ляглі на сэрца страты,
Яно яшчэ і праз гады баліць…
А сын, як ты, калісьці, вінавата –
Тваімі вачанятамі глядзіць.

* * *

Зжалі залатое жыта –
Пахне вёска свежым хлебам,
Вось яшчэ адна пражыта
Восень шчодрая пад небам.

* * *

Калі не хапае вады,
То полымем смага здаецца…
Жыццё пралятае. Тады
І сум нам як радасць даецца.

* * *

Нічога не бывае выпадковым…
Мой край, дзе нарадзілася, і мова,
Мае бацькі, настаўнікі, і дзеці,
І нават выпадковыя суседзі.

* * *

Вядома ж, што усё не выпадкова –
Быць мудрым хочаш, зразумей:
На шчасце кінута падкова,
Калі збіраеш зерне – сей.

* * *

Маўчання час
Таксама многа дасць,
Навучыць мару
Па Сусвету рухаць.
Каб нам было што
Людзям расказаць,
Каб ведалі,
Каго нам трэба слухаць.

* * *

Маўчыш, нават слова не мовіш,
Якую ўжо вечарыну…
Здурнелы ад позірка, ловіш
Прызнанне на вуснах жанчыны.

* * *

І ты хацела
Гучна так смяяцца!
І побач стаць са мной
На поўны рост?..
Дык перастань
Лукавага баяцца,
Нястрашны з Богам
Нават і пагост.

* * *

Мой сын малюе 21 век:
Машыны, спадарожнікі, планеты,
Згубіўся толькі недзе чалавек –
Нямашака нідзе яго прыкметаў.

* * *

Няўжо бязлюдна стане ў Беларусі,
Ільдом касмічным прыцярушыць Гомель?
І я з нябёсаў сумна усміхнуся
Радзіме, дзе гуляў ва ўсю Чарнобыль…

## БАБУЛІНА СПАДЧЫНА

*Трыпціх*

І

Спрачалася з бабкаю,
Бацькавай маці,
На роднае мове,
Пра Бога у хаце…

– Чаму яна моліцца
Гэткаму Богу,
Які не сумеў
Аблягчыць ёй дарогу?

– Няма, гэта значыць,
Бабуля, Ісуса!
(Усё перайначыць
У думках бяруся).

Бабуля крыжом
Асяняе мяне:
– Хай ліха, унучка,
Цябе абміне.

Не верыш – не трэба,
А лепей – маўчы,
Каб чорт не папутаў
Цябе уначы!

Бог мой міласэрны
Хлусню адвядзе.
Дасць розум табе,
За сабой павядзе.

Бог мой – відавочца
Учынкаў людзей,
Але ж неразумных
Шкадуе дзяцей.

II

Калісьці надзела
Сукенку-абнову.
Бабуля казала
На роднае мове:

– Сукенку, унучка,
З усмешкай насі,
Ды памятай толькі –
Не за-ра-сі!

Сукенку з юнацтва
Бярэгчы старайся,
Як гонар свой, родная,
Не забывайся!

III

Няма ўжо даўно
Бабулі на свеце.
І выраслі хутка
Унучкіны дзеці.

І хатка струхнела,
І вёска старэе,
Без прымавак бабкі
Хаціна нямее.

## 26 КРАСАВІКА

*Малітва*

Магутны Божа!
Іісус Хрыстос!
Малюся за усіх перасяленцаў:
Схавай ад гора пад крылом нябёс
Зямлю і нашыя людскія сэрцы.

Вярні нам веру ў нашае жыццё
І у Тваю, Гасподзь наш, міласэрнасць.
Сваім не пакарай нас забыццём,
Бо чалавечы век і так мізэрны.

Ратуй нашчадкаў, Госпадзі, ад страт,
Матуль парадуй і даруй грахі.
Хай на парог не ступіць нашых хат
Ні супастат, ні чалавек ліхі.

Пашлі анёлаў, няхай душы прымуць
Нябожчыкаў, што адышлі ў нябыт.
Ачысці родны кут ля рэчкі Прыпяць,
Што попелам чарнобыльскім накрыт.

Малітвамі Прачыстае Марыі
І Маці Багародзіцы святой,
Абарані у небе птушак вырай,
Які вяртаецца дамоў вясной.

Як людзі…
Зберажы іх, Божа мой!

## ЁН ПРЫЙДЗЕ ДА МЯНЕ

Ён прыйдзе да мяне:
Натхнёны і упарты,
Ён прыйдзе да мяне,
Як велічны узлёт.
Ён прыйдзе да мяне,
Як бліскавіца, яркі,
Ён прыйдзе да мяне,
Праз месяц, ці праз год…

Ён прыйдзе да мяне:
Упэўнены, прыгожы.
Ён прыйдзе ясным днём,
А, можа, – уначы.
Пастукае ў акно
У дождж густы. І, можа,
Я выбягу насустрач
І песня загучыць.

І хоць не у мяне,
А ў свет гэты ўлюбёны,
Ён прыйдзе да мяне,
Я веру, тым не менш…
Ён прыйдзе да мяне –
Рашучы, акрылёны,
Не абміне мяне
Мой самы лепшы верш.

## ЗМЕСТ

Не сумняваюся ў любові, не . . . . . . . . . . . 4
МУРАШЫ НА ЧОЎНЕ . . . . . . . . . . . . . . . . 5
...Лісцік кволы адарваўся . . . . . . . . . . . . 6
Бэз . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Мой след . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
...Сцяжына, што вядзе мяне дамоў. . . . . . . 9
Базар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Вёсцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Кралёўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
...О Госпадзі . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Надвячоркам . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Званы Чарнобыля . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Вёска Рудня . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
Малітва перасяленкі . . . . . . . . . . . . . . 18
Вярніце прэмію . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Мясакамбінат . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
...Сабака вые на балконе . . . . . . . . . . . . 21
...О Божа мой . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Роднаму гораду . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
Адвечнае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
...Цютчаўская, шчырая зямля . . . . . . . . . . 26
...О Эльбрус . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Студзень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
...Зіма усё запаланіла . . . . . . . . . . . . . 29
На вакзале . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

…Была даяркай мая маці . . . . . . . . . . . . 31
Дзядзька . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
…На крыжы распятая сяброўка . . . . . . . 34
Старая . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Сяброўцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Хай Усявышні чуе нас . . . . . . . . . . . . . . 37
Дачушцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
Чаславе-Марыі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Баю-баю, мой сынок . . . . . . . . . . . . . . . 42
…Ай люлі, люлі, люлі . . . . . . . . . . . . . . 43
Калыханка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Першы крок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Бацьку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Я не скарылася . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Табе. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
Родная мова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
…Што ёсць ласкавей беларускай мовы . . 50
Калыска раю (Трыпціх) . . . . . . . . . . . . . 51
…Пазіраю на іконы лік . . . . . . . . . . . . . 54
Паэту . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
…Калі удачу стрэнеш . . . . . . . . . . . . . . 56
Эцюд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
МАЁ ШЧАСЦЕ І ЛЕКІ . . . . . . . . . . . . . . 59
Мае набыткі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
…Шэсць руж табе прынесла . . . . . . . . . 61
…Лісцік з дрэва адарваны . . . . . . . . . . . 62
…Напэўна, я сатканая з кахання . . . . . . 63
Ды я ж уся твая . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
Расстанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65

Я верш каторы раз сасню . . . . . . . . . . 66
...Была жанчына адкрыццём . . . . . . . . . . 67
Развітальнае . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Навошта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Як мог . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Тадэвушу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Замова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
Да Бога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
...Мужчына . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
...Бліскавіцай спешнаю . . . . . . . . . . . 75
Калі ты пойдзеш ад мяне . . . . . . . . . . 76
Калі б ты ведаў . . . . . . . . . . . . . . . 77
Пад Новы год . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Матылёк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Адкажы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
...Лічыла – ты адзіны назаўсёды . . . . . . 81
Трыпціх. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
Ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
Сон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
Дзень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
...У тую рэчку ты не ступіш, не. . . . . . . 85
Мінуламу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Чаканне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
...Любы мой чалавек . . . . . . . . . . . . . 89
...Кахаю я цябе . . . . . . . . . . . . . . . . 90
Толькі табе . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
...Ты далёка недзе . . . . . . . . . . . . . . 92
...Маці Багародзіца . . . . . . . . . . . . . 93
Любаму . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94

ПЕГАС ЛЁГКАКРЫЛЫ 95
...Калі душа ляціць у вырай . . . . . . . . . 96
Жарт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
...Чаму цябе раней я не спаткала . . . . . . 98
Пасля разводу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
Жартоўнае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
Герой . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 101
Глядзі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
...Дзе ты, любы, заблудзіўся . . . . . . . . 103
...Дык няўжо ты быў так рады . . . . . . . . 104
...Як упала пажоўклае лісце . . . . . . . . . 105
Вяртанне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Сказаў мне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
...Што сорак год, сівыя скроні . . . . . . . . 108
Іванку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
У цырульні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
Памочніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
...Жыта пасля зімняй сцюжы . . . . . . . . . 113
Чароўны сон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
Несцерка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
...З каханым не спрачалася . . . . . . . . . 116
Дуракаваты . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Котка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
...Хутка як бягуць гады . . . . . . . . . . . . 119
Сёння . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
Шчасце . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121
...– Як добра, што каровы не лятаюць . . 122
Зайздросніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
...Раней бы ў душы крыўдавала . . . . . . 124
Крытыку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125

...Не верыш у каханне? Божа мой!.. . . . . . . 126
Танга . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Ключы ад шчасця . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
Хай кажуць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
...Ехаць не баюся . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
...Хітруеш – гэта ведаю даўно . . . . . . . . . 132
...Я марыла і дні, і ночы . . . . . . . . . . . . . . 133
...Дзякую, што марыш . . . . . . . . . . . . . . . . 134
Спадніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
СЛУХАЮ РЭХА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
Сузор'е этыкі жывой . . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
Дажынкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159
Бабуліна спадчына (Трыпціх) . . . . . . . . . . 166
26 красавіка (Малітва) . . . . . . . . . . . . . . . . 168
Ён прыйдзе да мяне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 169